ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.9 (3225) ● ПЯТНІЦА, 11 САКАВІКА, 2011

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Кніга, якой можна ганарыцца
Стар. 2

Знічкі Айчыны
Стар. 3

Золата Кацярыны і Канстанціна
Першае месца і залаты медаль на VIII Міжнародным харэаграфічным фестывалі-конкурсе “Танцавальны Алімп”, які праходзіў у Берліне, заваявалі салісты беларускага балета Стар. 4

ТРАДЫЦЫІ

Весела на Масленіцу!

Іван Яцкавец

Майму сябру жонка падарунак на Масленіцу зрабіла: бліноў па новым рэцэпце напякла. У беларускай прасторы інтэрнэту адшукала майстар-клас, спецыяльна да Масленіцы падрыхтаваны. Там найсмачнейшыя аладкі — усё на здымках відаць — вучыць пячы шэф-повар аднаго з мінскіх рэстаранаў.

Сябру цяпер — увесь год Масленіца! І заўважце, як актыўна асвойвае новую інфапрастору, як і зоны масавага адпачынку, гэтая прадаўняя народная традыцыя. Нібы сонца прамяні — усюды пранікае. Яна і ў інтэрнэце, і на рынках у выглядзе невялічкіх кафэ, дзе пякуць бліны з добрым дзясяткам розных начынак, і пры музеях краязнаўчых, і шматлікія аграсядзібы запрашаюць адсвяткаваць Масленіцу. “Студэнты, моладзь вельмі любяць Праводзіны зімы, Масленіцу, іншыя народныя святы, таму яны ўжо сталі ў нас традыцыйнымі, — расказалі мне ў Беларускім дзяржуніверсітэце інфарматыкі і электронікі. — Сёлета вялікае свята ладзілася каля аднаго з інтэрнатаў. Шумеў кірмаш, дзе можна было пачаставацца блінамі, розным печывам, папіць гарбаты з самавараў. Удалося і карнавальнае прадстаўленне з блазанамі, скамарохамі, карагодамі, а таксама абрадавым спальваннем пудзіла Зімы. На свяце ўсіх захоплівалі гульні, конкурсы з прызамі. Карацей — адсвяткавалі Масленіцу як мае быць!”

Масленічныя гульні, забавы ладзяць у Беларусі нават у дзіцячых садках. Дарэчы, культуролагі сцвярджаюць, што яшчэ ў дзяцінстве чалавецтва, калі Сонца вельмі шанавалі і лічылі адным з галоўных багоў у язычніцкім пантэоне, бяруць пачатак сонечныя містэрыі. Вось і кожны блін — сімвал Сонца, таму на Масленіцу яму столькі павагі. Цікава было пад час містэрый усім — як цяпер на Масленічных святах, якія спрадвеку ладзяцца па гарадах і вёсках Беларусі. Напярэдадні вясны, калі Сонца бярэцца ў сілу, у пару “дзяцінства чалавецтва” штогод акунаюць нас абрадавыя песні, у якіх дзяўчаты гукаюць вясну, і карагоды вакол вогнішча, і спальванне Зімы — сімвалу холаду і ліха. Зіма, дарэчы, сёлета сапраўды ўсім паднадакучыла: амаль ад Калядаў маразы, і на ўвесь сакавік у сіноптыкаў — “халодны” прагноз.

Затое на Масленіцу — усім весела і цёпла, нават у маразы. Бо сагравае свята, што маем у спадчыну ад продкаў, і светлая думка: а вясна ўсё ж побач!

У шчодрай Масленіцы заўсёды шмат і смачных бліноў, і вясёлых гульняў

ВЕСТКІ

Веды дапамагаюць развіццю

Беларусь увайшла ў катэгорыю краін з высокім узроўнем пісьменнасці дарослага насельніцтва. Аб гэтым інфармавала дыпламат Зоя Калантай на 55-й сесіі Камісіі па становішчы жанчын у штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку.

Пасяджэнне прысвячалася доступу жанчын і дзяўчат да адукацыі, іх удзелу ў развіцці навукі. Зоя Калантай падкрэсліла, што ў Беларусі 100-працэнтны ахоп дзяцей пачатковай і базавай сярэдняй адукацыяй.

“З задавальненнем адзначаем, што ў дакладзе Генеральнага сакратара ААН да 55-й сесіі Камісіі па становішчы жанчын знайшла адлюстраванне інфармацыя Рэспублікі Беларусь аб нацыянальным вопыце ў галіне гендарнай роўнасці, уключаючы стварэнне ўмоў і магчымасцяў па працаўладкаванні жанчын”, — сказала дыпламат. Зоя Калантай нагадала, што краіна датэрмінова выканала мэту развіцця тысячагоддзя, звязаную з дасягненнем усеагульнай пачатковай адукацыі. Цяпер у Беларусі агульная базавая адукацыя з'яўляецца абавязковай. Згодна з дакладам ПРААН аб развіцці чалавека ў 2010 годзе Беларусь увайшла ў катэгорыю краін з высокім узроўнем пісьменства дарослага насельніцтва — 99,7 працэнта.

У краіне жанчыны і мужчыны маюць аднолькавыя ўмовы ў выбары прафесіі або спецыяльнасці, доступе да адукацыі і атрымання дыпломаў у навучальных установах усіх катэгорый. А для таго, каб жанчыны ахвотней займаліся прадпрымальніцтвам, у Беларусі створаны лакальныя рэсурсныя цэнтры для навучання жанчын асновам бізнесу, ім аказваецца дзяржпадтрымка пры адкрыцці ўласнай справы.

ЗЕМЛЯКІ

Родныя душы, цёплыя сустрэчы

Чым найперш могуць паказаць сябе нашы землякі ў замежжы? Мусіць, песняй. Вельмі яскрава было відаць тое на Агульнапольскім фэсце “Беларуская песня-2011”.

Іван Ждановіч

Пад час фэсту трохі расказаў пра яго чытачам Ян Сычэўскі, старшыня галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства. А цяпер — паглядзім на свята вачыма гасцей з Беларусі.

Цікавая дэталь: упершыню я браў інтэрв'ю ў мужчыны з немаўляці на руках. Кіраўнік арт-гурта “Беларусы” Валерый Шмат, якому тэлефанаваў, не стаў адкладваць размову на потым, пажартаваў: Герману ўжо 7 месяцаў, і яму цікава будзе слухаць, што расказвае тата.

“Беларусы”, нагадаю, былі гасцямі фэсту, выступалі на розных пляцоўках Беласточчыны, а на гала-канцэрце ў Беластоку, у Вялікім драмтэатры, спявалі цэлае аддзяленне. “Праект у Беластоку надзвычай цікавы і вельмі патрэбны, — лічыць Валерый. — Гэта, вядома ж, знакавы фэст для развіцця, пашырэння беларускай культуры. Мы ў захапленні ад таго, як шчыруюць энтузіясты, у прыватнасці Ян Сычэўскі, яго памочніца Валянціна ў гэтым кірунку. Яны, маючы грамадскі статус, робяць для нашай культуры столькі, як часам цэлыя арганізацыі са штатам людзей.

→ Стар. 2

ЗЕМЛЯКІ

Родныя душы, цёплыя сустрэчы

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Міжволі задавалі сабе пытанне: а ці такія ж мы паслядоўныя ў адстойванні беларускасці? Што важна, масавы песенны рух на Беласточчыне аніяк не звязаны ні з палітыкай, ні з нейкімі бізнес-праектамі. Я, дарэчы, і раней заўважаў: часта праекты рухаюцца не грашыма — справа ў людзях. Сустракаў і пад час ранейшых гастроляў шчырых патрыётаў за тысячы кіламетраў ад Беларусі — і яны таксама зберагаюць беларускую мову, культуру. Гэткаму бескарыслівому служэнню беларускай ідэі можна ўсім павучыцца".

Большасць твораў, якія выконвалі самадзейныя калектывы на фэсце, былі народнага, лірычнага плану. А "Беларусы" прывезлі землякам праграму "Сусветная музыка галасамі беларусаў" — яна створана пры падтрымцы Міністэрства культуры. "У ёй многія сусветна вядомыя творы ўпершыню гучаць на нашай мове, — прадаўжае Валерый. — Мы спяваем іх як на мове арыгінала, так і па-беларуску. Прызнаюся, перажывалі: як прымуць гледачы, слухачы такі сінтэз, інтэграцыю культур? А ў нашым праекце менавіта мова беларуская — гэта мова яднання. І прыгажосць яе яшчэ ярчэй праяўляецца пры выкананні лепшых твораў сусветнай спадчыны".

Спевакі з Беларусі высока ацанілі ўзровень арганізацыі канцэртаў у Бельску Падляскім, Гайнаўцы. Апошнюю Валерый Шмат ведае з часу вучобы ў Беларускай кансерваторыі. Ён вучань знакамітага прафесара-дырыжора Віктара Роўды, а хор кансерваторскі часта ездзіў туды на фестывалі духоўнай музыкі. "А ў Бельску Падляскім уразіла, што там вельмі моцны беларускі дух, творча працуе гурт "Маланка", — згадвае Валерый. — І наогул на Беласточчыне пры дамах культуры шмат беларускамоўных калектываў. Людзі прыходзяць, як гавораць, на жаданні, вучацца спяваць па-беларуску ў вольны час, некалькі разоў на тыдзень. Да таго ж самі развучваюць новыя творы, на прыстойным узроўні робяць праграмы. І жывуць гэтай беларускасцю".

Артысты арт-гурта "Беларусы" выступілі на Беласточчыне з вялікім поспехам

Валерый — а ён і кампазітар, арганіст, дырыжор — з уласнага вопыту ведае, як шмат у мастацкай самадзейнасці залежыць ад кіраўніка калектыву. Калі нехта жыве творчасцю, з'яўляюцца аднадумцы — і нібы вакол ядра ў соленасычаным растворы расце прыгожы крышталь. Артысту імпануе, што энтузіястаў беларускай песні на Беласточчыне вельмі шмат. Ён упэўнены, што "крышталь народнай творчасці" там яшчэ зайграе новымі фарбамі.

У складзе беларускай дэлегацыі на фэсце быў і супрацоўнік апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Сасновіч. Ён расказаў, што на гала-канцэрце з цёплым словам выступіў пасол Беларусі ў Польшчы Віктар Гайсёнак, удзельнікаў і гасцей віталі прадстаўнікі ўлады Падляскага ваяводства.

Канцэрт атрымаўся святочным, разнастайным. Выступалі 26 лепшых калектываў і выканаўцаў беларускай дыяспары Беласточчыны і Варшавы, госці з Мінска. "Прыемна было чуць, як пад час канцэрта вядучыя гаварылі, што сцэнічныя касцюмы для гурта "Світанак", а гэта выхавальнікі Беластоцкага дзіцячага беларускага садка №14, пашыты на сродкі апарата Упаўнаважанага, — расказаў Аляксандр Сасновіч. — А тое, як выглядаюць артысты на сцэне, пагадзіцеся, вельмі істотна! Усяго ж у канцэрце, падлічыў, удзельнічала 8 гуртоў, якім мы, выкарыстоўваючы сродкі дзяржавы, дапамаглі набыць годны сцэнічны вобраз. Тут варта згадаць гурт "Знічка" з навучэнцаў Гайнаўскага ліцэя з вывучэннем беларускай мовы, дуэт "Зараніца" з вёскі Крынкі, ансамблі "Чыжаване" з вёскі Чыжы, "Сямейнае трыо" з вёскі Верхавіна, калектыў "АС" з Беластока, хор "Маланка" з Бельска Падляскага, хор "Калінка" з Беластока… Вось такая канкрэтная падтрымка ідзе ад Бацькаўшчыны беларускай дыяспары ў Польшчы".

А. Сасновіч сустракаўся з шэрагам кіраўнікоў творчых калектываў Падляскага ваяводства. "Голас Радзімы" ўжо расказваў, што ў нас добрыя стасункі з калектывам "АС", якому мы таксама дапамаглі з касцюмамі, — згадвае Аляксандр Сасновіч. — Цяпер артысты просяць, каб супрацоўнікі апарату Упаўнаважанага і надалей спрыялі ў арганізацыі іх выступленняў у Беларусі. Між іншым, той факт, што ў "АСа" цяпер новы сцэнічны імідж, падштурхнуў гурт зноў паўдзельнічаць у фэсце, артысты прыгожа выступалі і на гала-канцэрце". Арганізатарам фэсту А. Сасновіч перадаў каштоўныя прызы для заахвочвання лепшых самадзейных калектываў, кампакт-дыскі з відэазапісамі беларускіх абрадаў і выступамі беларускіх калектываў. А яшчэ — новыя нацыянальныя канцэртныя касцюмы, пашытыя ў Беларусі па просьбе самадзейных артыстаў з Польшчы.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

Кніга, якой можна ганарыцца

Пра тое, што нашы землякі ў Данецкай вобласці выдалі кнігу "Беларусы Данеччыны", "Голас Радзімы" ўжо расказваў. І вось новае паведамленне: у Данецкай абласной навуковай бібліятэцы імя Н. К. Крупскай прайшла прэзентацыя выдання.

Імпрэзу ладзіла Данецкая абласная грамадская арганізацыя "Культурна-асветнае таварыства беларусаў "Нёман", кіраўнік якога Сафія Пасынкава выступіла і аўтарам-складальнікам кнігі. А выдадзена яна пры падтрымцы Данецкай абласной дзяржадміністрацыі.

Цяпер суполка "Нёман", як бачна, мае аўтарытэт у горадзе, вобласці. У яе ўваходзіць нямала таленавітых людзей, якія, кожны па-свойму, робяць значны ўклад у развіццё Данбаса, Украіны ў цэлым. І пры гэтым клапоцяцца пра культурную спадчыну беларусаў рэгіёна, дбаюць пра развіццё гандлёва-эканамічных, культурных сувязяў паміж Данеччынай і Беларуссю. А кніга, як напісала ў рэдакцыю Сафія Пасынкава, і стваралася, каб не перарывалася повязь пакаленняў, каб моладзь ведала пра добрыя справы, стваральную працу нашых суайчыннікаў. "Мы сістэматызавалі інфармацыю пра беларусаў, сучаснікаў з Данеччыны, якія добра вядомыя, — піша С. Пасынкава. — У іх ліку такія людзі, як заснавальнік нашай суполкі Анатоль Акушка, ён цяпер Ганаровы консул Беларусі ва ўсходніх абласцях Украіны. Расказалі пра Віталя Курашыка, гэта дзяржаўны дзеяч Украіны, дыпламат, ён быў і першым паслом Рэспублікі Беларусь ва Украіне. Наш зямляк і Валерый Казакоў — Герой Украіны, ён акадэмік Акадэміі медыцынскіх навук Украіны, доктар медыцынскіх навук, прафесар, ганаровы рэктар Данецкага нацыянальнага медыцынскага ўніверсітэта. У медыцыне праявіў сябе і Віктар Ельскі — член-карэспандэнт Акадэміі медыцынскіх навук, доктар, прафесар, загадчык кафедры патафізіялогіі Данецкага медуніверсітэта. Наш вядомы супляменнік Генадзь Чыжыкаў — прэзідэнт Данецкай гандлёва-прамысловай палаты, доктар эканамічных навук, прафесар, ганаровы прэзідэнт Данецкага абласнога аб'яднання беларусаў. А Міхаіл Нічыпар — моцны гаспадарнік, ён дырэктар дэпартамента Міністэрства вугальнай прамысловасці Украіны. І яшчэ шэраг цікавых імёнаў, біяграфій увайшло ў кнігу, якая выдадзена, што важна, на двух мовах: рускай і беларускай".

На выставе ў Данецку — шмат кніг пра Беларусь

На прэзентацыю сабраліся навукоўцы, выкладчыкі, студэнты данецкіх вышэйшых навучальных устаноў, нашы супляменнікі, прадстаўнікі грамадскасці горада, журналісты. Выступалі адказныя асобы з Данецкай дзяржадміністрацыі, пасольства Беларусі ва Украіне, іншыя аўтарытэтныя людзі. Яны адзначалі, што выданне кнігі — значная падзея ў жыцці дыяспары. У бібліятэцы на стэндах былі выстаўлены кнігі пра Беларусь, творы беларускіх пісьменнікаў з бібліятэчных фондаў. Дэманстраваліся відэафільмы пра Беларусь, дзейнасць суполкі беларусаў "Нёман".

Новыя дарогі слова

Сяргей Шычко

У Душанбэ другім выданнем пабачыла свет кніга пра беларуска-таджыкскія літаратурныя сувязі

Таджыкскае выдавецтва "Эрграф" выпусціла ў свет ёмісты том артыкулаў, нарысаў, эсэ Ато Хамдама і Алеся Карлюкевіча "Дружба народаў — дружба літаратур". Прадмова да кнігі пад назвай "Арбіта цывілізацыі" належыць пяру доктара філалагічных навук Абдувалі Даўронава. Матэрыялы, сабраныя пад адной вокладкай, расказваюць пра развіццё пісьменніцкіх, перакладчыцкіх стасункаў паміж Беларуссю і Таджыкістанам у апошнія некалькі гадоў.

Варта нагадаць, што толькі ў Душанбэ пабачылі свет кнігі такіх аўтараў з Беларусі, як Георгій Марчук, Мікола Мятліцкі, Юрый Сапажкоў, Алесь Карлюкевіч, а таксама два калектыўныя зборнікі паэзіі і прозы. У ролі перакладчыкаў на таджыкскую мову выступілі Ато Хамдам, Нізом Касім, Саідалі Мамур, Аскар Хакім і іншыя творцы. У апошнія гады таджыкская проза, паэзія загучала і ў новых перакладах на беларускую мову.

Знічкі Айчыны

Магілёў – з тых беларускіх гарадоў, чыю даўніну лепш хіба што ўяўляць, карыстаючыся многімі гістарычнымі крыніцамі, чым адкрыта з ёю сустракацца. Войны, і асабліва Вялікая Айчынная, а таксама часы знявагі да гістарычных помнікаў – усё гэта зрабіла сваю справу. І ўрэшце аказаліся раструшчанымі многія, нават вельмі трывалыя раней, матэрыяльныя памяткі пра іншыя эпохі.

Магілёў. Разліў Дняпра. Пачатак XX ст.

Магілёў. Вялікая Садовая вуліца. Пачатак XX ст.

Магілёў. Вакзал. Пачатак XX ст.

Магілёў. Тэатральная плошча. Пачатак XX ст.

Алесь Карлюкевіч

Узнаўляючы нешта пэўнае ў свядомасці, нельга не звяртацца да лёсаў нашых суайчыннікаў. Іх жыцці — крыніца ўвагі да гістарычных мясцін. Па кропельках збіраю, прыкладам, інфармацыю пра аднаго з нашых суродзічаў. Мо, спадзяюся, дзе ў звязку з адкрыццём яго біяграфіі і ўсплыве яшчэ ўяўленне пра даўні Магілёў… З дваран Магілёўскай губерні — Міхаіл Іванавіч Лявіцкі. Нарадзіўся ў 1761 годзе. Асоба яркая, шматаблічная, хаця ўсё жыццё займаўся адным галоўным клопатам — ваяваў з ворагамі Расійскай імперыі. У лістападзе 1781 года ўступіў падпрапаршчыкам у Полацкі пяхотны полк. Удзельнічаў у руска-турэцкай вайне 1787–92 гадоў. Вызначыўся пры штурме Ачакава. Пасля ён удзельнічаў у бітве пры Каўшанах, ва ўзяцці Акермана. Штурмаваў Ізмаіл. Пасля служыў у Польшчы, ваяваў з паўстанцамі Тадэвуша Касцюшкі. У 1798-м магіляўчанін быў прызначаны камандзірам Кіеўскага грэнадзёрскага палка. У 1803-м атрымаў чын генерал-маёра. З мая таго ж года — шэф Падольскага мушкецёрскага палка. Ваяваў пры Аўстэрліцы. Змагаўся з французамі ва Усходняй Прусіі ў 1806—1807 гадах, за тое быў адзначаны ордэнам святога Георгія 4-й ступені. Атрымаў ордэн — "Pourle Merite" — і ад прускага караля. З кастрычніка 1810-га Міхаіл Лявіцкі— камандзір 3-й брыгады 7-й пяхотнай дывізіі. Незадоўга перад Барадзінскай бітвай быў прызначаны камендантам Мажайска. У 1814-м Лявіцкі — камендант Варшавы. У 1829-м наш зямляк атрымаў чын генерала ад інфантэрыі. У адстаўку выйшаў у 1831 годзе, пісаў мемуары, і нам засталося толькі знайсці тыя запісы генерала-зямляка. І, можа быць, там будуць памяткі, згадкі пра стары Магілёў і яго ваколіцы?

Цікавы лёс у Станіслава Юльяна Астрога, які нарадзіўся ў Магілёве ў 1830-м, а памёр у Лондане ў чэрвені 1890 года. У гісторыі гэты наш зямляк застаўся як палкоўнік Асманскай арміі ў Турцыі, англійскі вынаходнік і фотамастак, а яшчэ і як паэт. Нарадзіўся Станіслаў у сям'і міравога суддзі Антона Астрога. Пасля падаўлення паўстання 1830—31 гадоў разам з бацькамі эміграваў у Францыю. Прыняў удзел у Крымскай вайне 1853—1856 гадоў — як капітан дывізіі султанскіх казакоў пад камандаваннем англійскага генерала Генры Найта Сторкса. З 1854 года — палкоўнік асманскай арміі. Пасля Крымскай вайны жыў у Англіі. Прыняў брытанскае грамадзянства. У Англіі займаўся вынаходніцтвамі ў розных галінах навукі і тэхнікі. Пасля на некаторы час перасяліўся ў Парыж. Заснаваў фотаграфічную фірму "Walery". Пісаў і друкаваў вершы на польскай мове. Вярнуўся ў Англію, адкрыў фотасалон, рабіў партрэты многіх знакамітасцяў.

З болей маладзейшых сведкаў гістарычнага сталення Магілёва — Ісай Шур, які нараджэннем з 1875 года. У гісторыі розных краін ён застаўся як вучоны, матэматык. Бацькі Ісая — магіляўчане Моша Шур і Голда Ландау. Прозвішча маці вымушае задумацца пра сваяцкія сувязі з геніяльным Ландау. Але гэта — тэма асобнай гаворкі. Ісай закончыў Берлінскі ўніверсітэт. Вучыўся ў легендарнага Л. Фукса. Ужо ў 1901 годзе атрымаў ступень доктара навук. З 1910-га — прафесар Берлінскага ўніверсітэта. Вага яго ў навуковым свеце была настолькі вялікая, што ў 1929 яго выбіраюць замежным членам-карэспандэнтам Акадэміі навук СССР. А ў 1938 годзе гітлераўскія ўлады выключылі Шура з Прускай акадэміі навук. На шчасце, вучонаму ўдалося ўцячы ў Палесціну, дзе ён пасля і працаваў выкладчыкам Яўрэйскага ўніверсітэта ў Іерусаліме. Матэматыкі ведаюць і "лему Шура", і тэарэму Шура.

Яшчэ адзін магіляўчанін, пра след якога нельга не згадаць, — піяніст, канцэртмайстар Міхаіл Барысавіч Борхес. Нарадзіўся ў горадзе на Дняпры ў чэрвені 1909 года. У 1931 годзе закончыў Ленінградскую кансерваторыю, а затым і аспірантуру пры ёй. З 1943 па 1957 год быў акампаніятарам славутага Анатоля Вярцінскага. Іх гастролі праходзілі па самых розных кутках Савецкага Саюза. Вярцінскі высока цаніў выканальніцкую манеру нашага зямляка. Борхес самастойна, па пласцінках, вывучыў усе песні Вярцінскага, калі артыст яшчэ быў у эміграцыі. І вось так склалася, што лёс звёў двух таленавітых людзей разам. І ўжо пасля смерці спевака Борхес падрыхтаваў сольную праграму "Чатырнаццаць гадоў з Вярцінскім", якая мела вялікі поспех. Піяніст іграў і спяваў, тонка адлюстроўваючы манеру Вярцінскага, тэмбр яго голасу. Захавалася сведчанне, што майстэрствам Борхеса як піяніста быў захоплены нават Сталін.

Параўнальна нядаўна я пазнаёміўся яшчэ з адным магіляўчанінам. Часта лістуюся з ім, сазвоньваюся. Прозвішча — Бязлепкін. Завуць Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся ў Магілёве ў 1950 годзе. Закончыў Ленінградскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча (1972), а затым — філасофскае аддзяленне ваенна-педагагічнага факультэта Ваенна-палітычнай акадэміі (1980), ад'юнктуру кафедры філасофіі Ваенна-палітычнай акадэміі (1985). У 1985-м Мікалай Іванавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю "Мова ваеннай навукі як сродак пазнавальнай дзейнасці ваенных кадраў (філасофска-метадалагічны аналіз)". У 1999-м — доктарскую дысертацыю "Філасофія мовы ў Расіі (XIX — сярэдзіна XX стагоддзя)". У 1968—2001 гадах Бязлепкін служыў ва Узброеных сілах СССР і Расійскай Федэрацыі: выкладчык, старшы выкладчык кафедры грамадскіх навук Ленінградскага вышэйшага зенітнага ракетнага каманднага вучылішча, выкладчык, старшы выкладчык, намеснік начальніка кафедры, начальнік кафедры гуманітарных і сацыяльна-эканамічных дысцыплін Міхайлаўскай ваеннай артылерыйскай акадэміі. Палкоўнік запаса. З 2000 года Мікалай Іванавіч адначасова працуе на кафедры гісторыі рускай філасофіі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 2000–2005 гадах — прафесар кафедры гісторыі рускай філасофіі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2001–2003 гадах — дэкан факультэта сацыяльнага кіравання Санкт-Пецярбургскай акадэміі кіравання і эканомікі. У 2003–2006 гадах — прарэктар па навуковай рабоце, з 2006-га — загадчык кафедры філасофіі ў той жа акадэміі. Мікалай Бязлепкін — аўтар манаграфій "Мова ваеннай навукі як сродак пазнавальнай дзейнасці ваенных кадраў" (1985), "Філасофія мовы ў Расіі : вопыт гісторыка-тэарэтычнай сістэматызацыі" (1999), "Філасофія мовы ў Расіі (XIX – сярэдзіна XX ст.)" (1999), "Філасофія мовы ў Расіі: да гісторыі рускай лінгвафілософіі" (2001, 2-е выд. — 2002) і больш чым 50 навуковых артыкулаў. Член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі вышэйшай школы. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём "300 гадоў Санкт-Пецярбургу".

Дык вось, у нашым ліставанні мы часта згадваем розных ураджэнцаў Магілёва. Часам новым адкрыццям здзіўляецца Мікалай Іванавіч, часам — я радуюся, што з падказкі вучонага некага заношу ў сваю памяць, а магчыма і адкрываю для Беларусі, нагадваю чытачам: вось пра каго мы забыліся. І неяк Мікалай Іванавіч выказаў такую прапанову: "А чаму б не ўшанаваць многіх зямлякоў, назваўшы іх імёнамі вуліцы Магілёва?" Давялося мне звярнуцца да гарадской тапанімікі абласнога цэнтра. І, канешне ж, прывёў некалькі прыкладаў, калі з вуліцамі Магілёва звязана памяць пра зямлякоў. Але, як ні дзіўна, статыстыка мая аказалася не дужа пераканальнай... На жаль, і ў Магілёве старыя і новыя вуліцы не часта называюцца імёнамі адметных людзей, якія нарадзіліся ў гэтым горадзе.

© В поисках утраченного

Паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава

ТАЛЕНТЫ

Золата Кацярыны і Канстанціна

Першае месца і залаты медаль на VIII Міжнародным харэаграфічным фестывалі-конкурсе “Танцавальны Алімп”, які праходзіў у Берліне, заваявалі салісты беларускага балета

Маладыя беларускія танцоўшчыкі Кацярына Алейнік і Канстанцін Геронік бліскуча выканалі па-дэ-дэ з балета “Дон Кіхот”. Журы высока ацаніла іх выступленне: Кацярына і Канстанцін заваявалі першае месца, ушанаваны залатым медалём, а таксама атрымалі спецыяльны прыз патрона фестывалю, дырэктара “Staatsballett Berlin” Уладзіміра Малахава. Беларуская пара ўдзельнічала ў гала-канцэрце, у якім выступалі і пераможцы конкурсу мінулых гадоў, і сёлетнія прызёры, салісты “Staatsballett Berlin”, і зоркі сусветнай сцэны.

Прэстыжны міжнародны конкурс “Танцавальны Алімп” лічыцца найбольш адказным у сферы інтэрнацыянальных харэаграфічных спаборніцтваў. З 2005 года “Танцавальны Алімп” уваходзіць у Асацыяцыю міжнародных конкурсаў артыстаў балета (прэзідэнт Юрый Грыгаровіч) і з'яўляецца членам Міжнароднага савета па танцы ЮНЕСКА. Фестываль праводзіцца штогод пад дэвізам “Танец — мова свету”. Пад час фестывалю праходзяць конкурсныя спаборніцтвы, сустрэчы кіраўнікоў калектываў, майстар-класы прафесійных педагогаў, сумесныя выступленні канкурсантаў з зоркамі сусветнай сцэны.

Кацярына і Канстанцін перамаглі, танцуючы

Важна і тое, што конкурсную праграму ацэньвае незалежнае журы, у склад яго запрашаюцца заслужаныя дзеячы культуры і мастацтваў, прафесійныя педагогі танца, дзеючыя выканаўцы, мецэнаты, прадстаўнікі СМІ і дзяржаўных структур. Старшынёй журы сёлета быў народны артыст СССР Уладзімір Васільеў. На конкурсных праглядах журы ацэньвае выступленне калектываў і салістаў у трох катэгорыях: “Майстэрства”, “Вобраз”, “Творчыя пачынанні”.

Асноўная мэта фестывалю “Танцавальны Алімп” — падтрымка і папулярызацыя харэаграфічнай творчасці, выхаванне мастацкага і эстэтычнага густу, міжнародны абмен творчымі дасягненнямі ў сферы харэаграфіі і танца. Цяпер ствараецца і дзіцячы харэаграфічны тэатр, у трупу якога ўвойдуць лаўрэаты і дыпламанты праведзеных ужо конкурсаў фестывалю.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

Сем навукоўцаў і драфа-красуня

З наступленнем вясны ў далёкія падарожжы адпраўляюцца не толькі пералётныя птушкі. Арнітолагі — таксама.

Іна Ганчаровіч

У Беларусі нямала добрых знаўцаў птушак, а прафесійныя якасці беларускіх арнітолагаў высока цэняцца пры выкананні буйных міжнародных праектаў. Адзін з іх цяпер рэалізуецца ў Сярэдняй Азіі. І, магчыма, калі пішуцца гэтыя радкі, вучоны Валерый Дамброўскі і ягоныя калегі шукаюць прыгожую птушку: драфу-красуню.

Чаму сёння ў свеце вялікая ўвага да драфы-красуні? Яна — адна з самых рэдкіх і малавывучаных птушак сямейства драфіных. Насяляе паўпустыні Еўразіі і Паўночнай Афрыкі. А цяпер, калі месцы яе традыцыйных гнездаванняў заняты пад сельгасвытворчасць, да таго ж кладкі яек часта разбураюць драпежнікі, не дрэмлюць браканьеры і ў дадатак да “шляхетнага” сакалінага палявання на драфу яе знішчаюць і звычайнай паляўнічай зброяй, — выжываць птушцы вельмі цяжка. Від ужо на мяжы знікнення, драфа-красуня занесеная ў Чырвоную кнігу. Як палічылі эксперты, штучная гадоўля птушак — адзіны спосаб адра-дзіць папуляцыю ў дзікай прыродзе. Для гэтага па ініцыятыве Аб’яднаных Арабскіх Эміратаў вылучаны велізарныя сродкі, у праекце прадугледжана арганізацыя спецпітомнікаў па гадоўлі птушанят. А ў якасці экспертаў прыцягнуты міжнародныя арганізацыі і спецыялісты, у тым ліку і з Беларусі.

“Хоць драфа-красуня і не беларускі аб’ект арнітафаўны, ды наш досвед палявых даследаванняў вельмі карысны ў выкананні праекта, — расказаў перад ад’ездам Валерый Дамброўскі, кандыдат біялагічных навук, загадчык лабараторыі арніталогіі Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах. — Прафесійныя якасці нашых арнітолагаў высока цэняцца. І калі спачатку ў экспедыцыях з беларускага боку было 4 арнітолагі, то цяпер едзе 7”.

Свае назіранні арнітолагі вядуць і вечаровай парой

Даследчыкі вывучаюць, дзе і як жыве, гняздуецца, як харчуецца драфа-красуня. У ліку вызначаных патрабаванняў да ўдзельнікаў экспедыцыі — веданне замежных моў, кіраванне аўтамабілямі-ўседарожнікамі, навыкі карыстання GPS-навігатарамі, картамі, досвед выжывання ў дзікай прыродзе. “Мы едзем у пустыню, да цывілізацыі адтуль далёка, — казаў Валерый, — і кожны, патрапіўшы ў нестандартную сітуацыю, павінен быць да таго гатовым. Рэдка хто з арнітолагаў-замежнікаў ездзіць цяпер у поле з палаткай, кацялком ды заплечнікам, а для нас гэта — звычайная справа. Мы можам цалкам аўтаномна жыць тыдзень-два, праводзіць назіранні — і пры тым не пакутаваць ад дыскамфорту”. У цане і працавітасць, адказнасць, трывучасць беларусаў.

Дарэчы, гэты міжнародны праект — не першы для беларускіх вучоных-арнітолагаў. Два гады таму па запрашэнні Расійскай акадэміі навук дырэктар і заснавальнік Тураўскай станцыі кальцавання птушак Павел Пінчук быў у якасці эксперта на Чукотцы, калі там шукалі вельмі рэдкі від куліка-лапатуна. Летась ён удзельнічаў у міжнароднай экспедыцыі па вывучэнні мігруючых птушак на сістэме азёр у стэпах Калмыкіі. Цяпер, як лічыць Валерый Дамброўскі, у лабараторыі арніталогіі працуе калектыў прафесіяналаў вельмі высокага ўзроўню. Іх веды, уменні запатрабаваны ў розных месцах свету.

СУСТЭЧЫ

Ад гор Дагестана

Сёлета Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа разам з Саюзам пісьменнікаў Беларусі пачаў ладзіць у Коласавым доме святы ў гонар тых, хто папаўняе шэрагі пісьменніцкай суполкі. Нядаўна госцем тут быў паэт і мастак Хізры Асадулаеў.

Выступаючы на імпрэзе, дырэктар музея Зінаіда Камароўская адразу ж выказала спадзяванне, што да 130-х угодкаў Якуба Коласа загучыць па-карацінску — на роднай мове Хізры Газіевіча — геніяльная паэма беларускага песняра “Новая зямля”. Рэй на вечарыне вяла музыказнаўца Іна Зубрыч, яна і распавяла пра незвычайна шырокі, шматгранны талент ураджэнца Дагестана. А членскі білет пісьменніцкай арганізацыі яму ўручылі старшыня Мінскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў і яго калега Наталля Кастучэнка.

Цёпла было на вечарыне ў коле сяброў. Гучалі словы падзякі за талент, былі пажаданні творчасці, кветкі. Вершы Хізры гучалі як па-карацінску, так і ў перакладах Рыгора Барадуліна на беларускую мову. І ўжо зусім утульна, па-хатняму зрабілася ў гасцёўні Коласавага дома, калі ў якасці чытальніка выступіў зусім юны сын паэта — з вершамі бацькі. Не шкадаваў словаў падзякі для сяброў і сам Хізры Газіевіч. А музею паэт падараваў аўтограф свайго перакладу верша Якуба Коласа “Беларусам” на карацінскую мову.

Пад канец сустрэчы Хізры Асадулаеў прыадкрыў прысутным новыя грані свайго таленту. У зале загучала мелодыя вальса, і паэт, лёгка прытанцоўваючы, заспяваў па-карацінску свой твор “У зімнюю ноч”.

Іван Дубовік,
супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа

Гісторыя ажывае

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце адкрыўся археалагічны музей-лабараторыя

Музей уключае дзве залы, дзе выстаўлены шматлікія экспанаты, сабраныя выкладчыкамі і студэнтамі гістарычнага факультэта пад час археалагічных практык і навуковых экспедыцый. Дзякуючы гэтым знаходкам музей паўнавартасна адлюстроўвае гісторыю гомельскага краю, пачынаючы з эпохі палеаліту і заканчваючы сучаснасцю. Гэты паўднёва-ўсходні рэгіён краіны мае ўнікальныя асаблівасці. Так, самыя старажытныя стаянкі эпохі каменнага стагоддзя на тэрыторыі Беларусі былі знойдзены менавіта ў Гомельскай вобласці — ля вёсак Бердыж Чачэрскага і Юравічы Калінкавіцкага раёнаў.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб’ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1960
Заказ: 290
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.
© “Голас Радзімы”, 2011